Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 23 (235) | Панядзелак, 7 лістапада 1955 года | Цана 20 кап.




СЁННЯ савецкія людзі адзначаюць 38-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. У гэты дзень, які стаў для нас самым дарагім і радасным святам, кожны грамадзянін сваёй неабсяжнай соцыялістычнай Радзімы акіне позіркам нашы сённяшнія велічныя здабыткі і перамогі і той гераічны слаўны шлях, які падрыхтаваў нашу цудоўную яву.

Сёння на вуліцы і плошчы гарадоў і сёл выйдуць мільёны савецкіх людзей. Скупыя словы на святочных транспарантах раскажуць аб найвялікшай эпапеі творчых здзяйсненняў, аб пераможным ходзе Комуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Завершан пяты пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі па агульнаму аб'ёму прамысловай вытворчасці. На Волзе, Дняпры, на берагах сібірскіх рэк узводзяцца, пускаюцца ў строй магутныя гідраэлектрастанцыі. Рапартуюць аб сваіх дасягненнях працаўнікі сельскай гаспадаркі, уздымаюцца мільёны гектараў цаліны.

Народжаная ў агні кастрычніцкіх баёў, Совецкая краіна за 38 год свайго існавання непазнавальна змяніла сваё аблічча. Яна стала краінай культуры, краінай прагрэсу ўсяго чалавецтва. Толькі ў гэтым годзе звыш 640 тысяч маладых спецыялістаў з дыпломамі ВНУ і тэхнікумаў уліліся ў многамільённую армію будаўнікоў комунізма.

Кіруючыся вялікімі ленінскімі запаветамі, Комуністычная партыя праяўляе няспынныя клопаты аб далейшым павышэнні культурнага ўзроўню народа, аб новым уздыме навукі і культуры. Без гэтага немагчыма ісці наперад, да новых перамог комунізма.

Вялікія заслугі совецкіх вучоных, чыя праца садзейнічае паспяховаму вырашэнню народнагаспадарчых задач. Іменна на совецкай зямлі пабудавана першая ў свеце электрастанцыя, якая працуе на атамнай энергіі, дасягнуты выдатныя перамогі ў многіх галінах навукі.

Але абавязак нашых вучоных— няўхільна рухаць наперад совецкую навуку, не заспакойвацца на дасягнутых поспехах. Вялікія і адказныя задачы паўстаюць перад работнікамі вышэйшай школы, перад усім нашым слаўным студэнцтвам. Інтарэсы совецкага народа патрабуюць яшчэ вышэйшага ўзроўню вучэбнай і выхаваўчай работы ў нашых ВНУ, з тым, каб яны рыхтавалі ўсебакова развітых, працалюбівых грамадзян соцыялістычнага грамадства, актыўных будаўнікоў комунізма. Да гэтага заклікае нас Комуністычная партыя.

Совецкая дзяржава нарадзілася са словам: мір. Першым дэкрэтам Совецкай улады быў дэкрэт аб міры. Ад гістарычнага ленінскага дэкрэта і да сённяшняга дня наша краіна няўхільна змагаецца за мір і дружбу паміж народамі. Год святкавання 38-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ўвойдзе ў гісторыю як год, які прынёс нашаму народу новыя перамогі ў справе ўмацавання міру і дружбы паміж народамі. Лагер міру, дэмакратыі і соцыялізма стаў у нашы дні магутнай і непераможнай сілай—яго сцяг нясуць 900 мільёнаў чалавек.

Ідэі Вялікага Кастрычніка сталі блізкімі і дарагімі працоўнаму чалавеку кожнай краіны свету. Існаванне магутнага лагера соцыялізма ўмацоўвае ў рабочага класа, усіх працоўных свету веру ў свае сілы, у поўную перамогу вызваленчых ідэй Кастрычніцкай рэволюцыі.

Совецкі народ, згуртаваны вакол Комуністычнай партыі, цвёрда і ўпэўнена ідзе па шляху завяршэння будаўніцтва соцыялізма і паступовага пераходу да комунізма. Ён поўны рашучасці забяспечыць пабудову комуністычнага грамадства ў нашай краіне і тым самым пракласці шлях да комунізма для ўсяго чалавецтва.

## ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ КАСТРЫЧНІКУ

3 лістапада адбыўся вечар, прысвечаны 38-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Студэнты праслухалі змястоўны, пабудаваны на цікавых прыкладах даклад аб заваёвах Кастрычніка, які зрабіў Т. А. Базылеў.

Як заўсёды, парадавалі гледачоў сваімі выступленнямі універсітэцкія артысты—спевакі, танцоры, дэкламатары, канферансье.

З поспехам выступілі артысты з ансамбля АДА.

# Па універсітэту

## Поспехі вучоных

Напружаным быў мінулы год для вучоных універсітэта. Прафесар Лушчыцкі закончыў манаграфію, прысвечаную разгляду пытанняў перадавой грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі другой палавіны XIX в.

Вялікую работу ў галіне даследавання топахімічных рэакцый праробіў прафесар Паўлючэнка.

Прафесар Палетыка вядзе навуковую распрацоўку матэрыялаў архіва Міністэрства замежных спраў БССР. Гэтым самым кладзецца плённы пачатак вывучэнню ролі Беларускай ССР на міжнароднай арэне.

Нядаўна Вучоны совет універсітэта вылучыў кандыдатамі ў правадзейныя члены і члены-карэспандэнты Акадэміі навук БССР лепшых вучоных універсітэта. Гэта тт. Лушчыцкі, Палетыка, Вінберг, Фёдараў, Паўлючэнка, Дарожкін.

**З. КАЦ.**

## Студэнцкі лекторый

У бліжэйшыя дні ва універсітэце пачынае сваю работу студэнцкі лекторый. Асноўная мэта лекторыя — садзейнічаць павышэнню ідэйна-тэарэтычнага і культурнага ўзроўню студэнтаў. Гэтай мэце і адпавядае распрацаваная і зацверджаная партыйным камітэтам тэматыка лекторыя. Яна ўключае ў сябе розныя тэмы па найбольш актуальных пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі, па навейшых дасягненнях навукі і тэхнікі, а таксама па літаратуры і мастацтву. У прыватнасці, будуць прачытаны лекцыі на такія тэмы: «Аб 50-годдзі першай рускай рэволюцыі», «Крытыка сучаснай буржуазнай філасофіі», «Значэнне тэхнічнага прагрэсу ў развіцці соцыялістычнай вытворчасці», «Мечаныя атамы і іх выкарыстанне ў народнай гаспадарцы», «Прырода і гаспадарка Індыі», «Будова і развіццё сусвету», «Міцкевіч і беларуская літаратура».

Да чытання лекцый прыцягнуты найбольш кваліфікаваныя лектары з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта — прафесары Годнеў, Турбін, Дарожкін, дацэнты Сцяпанаў, Мацко, Пахута, Баравік, Фактаровіч і інш.

**Т. БАЗЫЛЕЎ.**

## У АСПІРАНТАЎ

Перыядам упорнай вучобы, шуканняў і працы быў мінулы год для аспірантаў нашага універсітэта. І добрыя вынікі ў наяўнасці. Паспяхова абаранілі дысертацыі тт. Бадзяй, Ермоленка, Дашкевіч, Шыраканаў. Важныя навуковыя і народнагаспадарчыя праблемы вырашалі ў сваіх дысертацыях аспіранты Свірыдаў, Лепін, Бокуць і Гапоненка. Сваю дысертацыю аспірант Гапоненка прысвяціў пытанню мінеральнага ўгнаення сажалак. «Статыстычная тэорыя структуры паверхневага пласта вадкасці»—вось тэма дысертацыі аспіранта Бокуця.

**К. ШЫРОКІ.**

## Мічурынскія дні ва універсітэце

Шырока адзначалася ва універсітэце стагоддзе з дня нараджэння вялікага пераўтваральніка прыроды Івана Уладзіміравіча Мічурына.

Нядаўна тут адбылася навуковая сесія, прысвечаная гэтай знамянальнай даце. На сесіі быў прачытан рад дакладаў.

Даклад на тэму: «І. В. Мічурын — вялікі пераўтваральнік прыроды» зрабіў прафесар Н. В. Турбін. Даклады «Прымяненне мічурынскіх метадаў у фітапаталогіі» і «Уплыў мікраэлементаў на фотасінтэзіруючы апарат некаторых зернавых культур» прачыталі прафесар Н. А. Дарожкін і дацэнт С. В. Калішэвіч.

У чытальнай зале універсітэта афармлена вітрына з матэрыялаў, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці вялікага пераўтваральніка прыроды.

**І. СІПАКОЎ.**

## ВЫНІКІ ПЛЁННАЙ РАБОТЫ




Вялікую і плённую работу вядуць нашы вучоныя. Вынікі сваіх прац, вышукванняў, назіранняў і абагульненняў яны публікуюць у Вучоных запісках, якія выдаюцца ў выдавецтве універсітэта. У сучасны момант рыхтуюцца да друку Вучоныя запіскі ўсіх факультэтаў. У гэтым годзе выходзяць кнігі прафесара Г. Г. Вінберга «Інтэнсіўнасць абмену і харчовыя запатрабаванні рыб», Вучоныя запіскі юрыдычнага факультэта, зборнікі задач па совецкаму грамадзянскаму праву (пад рэд. дац. т. Гаўзе), працы комплекснай экспедыцыі па вывучэнню вадаёмаў Палесся (абагульненне працы калектыва навуковых работнікаў біяфака).

Напярэдадні свята вышлі ў свет кнігі нашых вучоных — прафесара К. І. Лукашова «Асноўныя генетычныя тыпы чацвярцічных адкладанняў СССР» і прафесара І. Н. Сержаніна «Млекакормячыя Беларускай ССР».

**П. ТКАЧЭНКА.**

## ТВОРЧАЯ САДРУЖНАСЦЬ

Чатыры гады кафедры агульнай фізікі і электрафізікі БДУ ажыццяўляюць вытворчую садружнасць з Маскоўскім поўправадніковым заводам. Да гэтай работы прыцягваюцца студэнты старшых курсаў, а галоўным чынам — дыпламанты-электрафізікі.

У гэтым годзе некалькі дыпламантаў працуе над тэмамі, звязанымі з паляпшэннем параметраў селенавых выпрамляльнікаў, што выпускаюцца маскоўскім заводам. Ці маглі нават марыць аб гэтым дзеці рабочых і сялян да рэволюцыі?



НА ЗДЫМКУ: студэнты А. Патаповіч і В.Старасельскі рыхтуюць устаноўкі для сваіх даследаванняў.

Фото Л. БОНДАРА




*Работнікі навукова-даследчых устаноў і вышэйшых навучальных устаноў! Рухайце ўперад савецкую навуку, павышайце ролю навукі ў тэхнічным прагрэсе нашай краіны! Развівайце крытыку недахопаў у навуковай рабоце! Паляпшайце падрыхтоўку спецыялістаў!*

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 38-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі)*

## БУДУЧЫНЯ Ў ВАШЫХ РУКАХ

Вялікі Кастрычнік даў радаснае і шчаслівае жыццё ўсім працоўным нашай краіны, бязмежныя магчымасці для атрымання адукацыі і развіцця талентаў адкрыў ён для нашай моладзі.

Пры царызме выхадцу з народа немагчыма было прабіць сабе дарогу да ведаў. Толькі адзінкам з нечуванымі цяжкасцямі ўдалося атрымаць вышэйшую адукацыю, выматваючы пры гэтым свае сілы на тое, каб дабыць сабе сродкі існавання ўрокамі, перапіскай, рознай выпадковай работай.

У іншых умовах вучыцца наша моладзь. Калі раней папасці ў гімназію для сына рабочага і селяніна было неажыццявімай марай, то цяпер сярэдняя адукацыя з'яўляецца абавязковай для ўсіх.

Шырока адчынены дзверы вышэйшай школы дзецям рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Для забеспячэння паспяховай вучобы моладзі партыя і ўрад стварылі ўсе неабходныя ўмовы. Усе паспяваючыя атрымліваюць у нас стыпендыю, інтэрнат , кнігі. Вышэйшая школа рыхтуе не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і палітычна развітых патрыётаў нашай Ґадзімы, гатовых абараняць і здольных развіваць вялікую справу Леніна—Сталіна.

Пры царызме толькі адзінкі займаліся даследчай работай. У савецкіх умовах даследчая работа шырока разгорнута ў 15 акадэміях навук, навукова-даследчых інстытутах, ВНУ і доследных станцыях вялікай арміяй вучоных. Больш таго, пераважная большасць студэнтаў вядзе ўжо ў сценах ВНУ даследчую работу, спаборнічаючы паміж сабой штогодным прадстаўленнем сваіх работ на агульнагарадскі агляд.

У капіталістычных краінах скончыўшыя ВНУ дрыжаць за сваю будучыню, многім з іх пагражаюць беспрацоўе і галоднае існаванне. Тых, хто заканчвае савецкія ВНУ, спецыяльныя дзяржаўныя камісіі загадзя, яшчэ да здачы дзяржаўных экзаменаў, размяркоўваюць на работу з улікам здольнасцей і схільнасцей.

Больш таго, многіх, што скончылі ВНУ, пакідаюць для паступлення ў аспірантуру, а для тых, хто накіраван на практычную работу, прадугледжана магчымасць далейшага навуковага росту як па месцу працы, так і праз завочную аспірантуру.

Тут міжволі ўспамінаюцца залатыя словы рускага паэта Некрасава—«Знай работай, да не трусь».

Большасці з нас, і мне ў тым ліку, пры царскім рэжыме ніколі-б не выйсці на шырокую дарогу навуковай творчасці. Толькі Вялікі Кастрычнік зрабіў наша жыццё радасным і шчаслівым. Як-жа пасля гэтага не берагчы, як зяніцу вока, дасягненні вялікага Кастрычніка, не змагацца за гэтыя дасягненні? Тым больш, што пры цудоўным сёнешнім мы ідзем да яшчэ больш квітнеючага заўтрашняга жыцця—комунізма.

**Н. Ф. ЕРМОЛЕНКА,**
**прафесар.**

## ...ЗЯКУЙ РОДНАЙ КРАІНЕ

...лы ёсць цудоўны верш «Мая навука». Ен, безумоўна, аўтабіяграфічны, і ў той-жа час у ім дадзена глыбокае абагульненне.

Мне мудрасці кніжнай не даў
бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх,—
Навучыўся я слоў беларускіх
ад маці,
І дум беларускіх без школы
і кніг.

У гэтым сэнсе Я. Купала не складаў выключэння. Яго лёс быў агульным лёсам для ўсіх дзяцей працоўнага народа, якім у царскі час дзверы ў навучальныя ўстановы, дарогі «да мудрасці кніжнай» былі наглуха закрыты.

Можна не сумнявацца, што ва ўмовах капіталістычнага ладу такая-ж доля сустрэла-б і мяне і маіх сяброў. Але адбылася Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя. Яна адкрыла нам дарогі ў навуку, у літаратуру, у мастацтва.

Беларускі дзяржаўны універсітэт, які носіць цяпер высокае імя В. І. Леніна, быў для мяне і майго пакалення не звычайнай вышэйшай навучальнай установай, а вялікай школай жыцця і рэвалюцыі. Тут, поруч з намі, маладымі, вучыліся людзі, якія прайшлі суровы шлях грамадзянскай вайны. У сценах універсітэта поруч з «кніжнай мудрасцю» мы пазнавалі з вопыту старэйшых сяброў глыбокую мудрасць рэвалюцыйнай барацьбы народа.

У час майго навучання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў ім вучыліся К. Крапіва, П. Броўка, П. Трус і многія іншыя таварышы, якія пасля занялі выдатнае месца ў літаратуры, у навуцы, у грамадскім жыцці. У сяброўстве з імі ў час універсітэцкага навучання выкрышталізоўваліся мае літаратурныя погляды.

Я глыбока ўдзячны свайму роднаму універсітэту за тыя веды, якія я атрымаў у ім, і за тое выхаванне, якое ён мне даў. Асабліва высока я цаню тое, што універсітэт навучыў мяне працаваць, навучыў ніколі не спыняцца на зведаным і пазнаным, а нястомна ісці да новых і новых глыбінь ведаў. І ўсім тым, што я зрабіў у літаратуры, я ў вялікай і вялікай ступені абавязаны універсітэту.

**Пятро ГЛЕБКА.**

*А. ХАРКЕВИЧ.*

### ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ

*В кругу друзей,*
*в потоке поздравлений,*
*окончивши*
*текущие дела,*
*мы отмечаем*
*дни своих рождений*
*в такой-то день,*
*такого-то числа:*

*иной—весной,*
*другой—порой осенней,*
*или зимой,*
*или в июльский зной...*
*...Но есть один,*
*всеобщий*
*День Рожденья*
*для всех живущих*
*правдою одной!*

*Он, этот день,*
*перевернул планету*
*и озарил*
*социализма высь—*
*в огне боев*
*родилась Власть Советов,*
*а вместе с ней*
*мы с вами*
*родились!*

## Дружба навекі

Моцная і непарушная дружба народаў магутнага Савецкага Саюза і Польскай Народнай Рэспублікі. Цесныя сувязі брацтва і ўзаемадапамогі звязваюць гэтыя міралюбівыя дзяржавы.

Дзякуючы дапамозе Савецкага Саюза польскі народ вызваліўся ад прыгнёту нямецкага фашызма і стаў на шлях мірнага будаўніцтва соцыялізма. З году ў год растуць і мацнеюць культурныя сувязі нашых народаў. Яркім прыкладам служыць перадача польскаму народу Палаца культуры і навукі, пабудаванага на сродкі Савецкага Саюза.

Мы, студэнты Народнай Польшчы, бязмежна рады, што здзейсніліся нашы мары—мы вучымся ў краіне самай перадавой навукі. Многае мы ўбачылі за час знаходжання ў Савецкім Саюзе. Усюды нас цёпла і радасна сустракалі. І пачуццё гэтай сустрэчы застанецца ў нашых сэрцах назаўсёды.

Мы ганарымся тым, што 38-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка будзем святкаваць у Савецкім Саюзе. Ганарымся таму, што Кастрычніцкае свята—свята не толькі савецкага, але і польскага народаў і іншых міралюбівых народаў свету.

**Н. МУКАСЕЙ.**

## КАСТРЫЧНІК АЗАРЫЎ МАЁ ЖЫЦЦЁ

...У 1917 годзе майму бацьку было адзінаццаць год. У 1922 годзе з Іркуцка, куды закінула яго імперыялістычная вайна, бацька вярнуўся ў родную вёску, што непадалёку ад мястэчка Зэльвы. Аб вучобе ў панскай Польшчы нельга было і марыць. На трох курсах фельчарскага вучылішча, закончаных у Іркуцку, і спынілася бацькава адукацыя. Усяго было ў бацькавым тагачасным жыцці: ён батрачыў, прымачыў, адслужваў у войску, як і многія ў той час.

Памятны верасень 1939 года здзейсніў бацькавы надзеі. А калі фашысты напалі на нашу Радзіму, ён не застаўся ў баку ад партызанскай барацьбы. Ен змагаўся за тое, каб не баяцца больш за шчасце сваіх дзяцей.

Я шчаслівы, што скончыў дзесяцігодку, універсітэт, што вучуся далей. Верасень 1939 года—маё другое нараджэнне. Маці дала мне жыццё. Ідэі-ж Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, якія прынёс мне векапомны Верасень, азарылі жыццё маё вялікай мэтай, зрабілі яго сапраўдным жыццём, і я аддам усе сілы і здольнасці справе нашай партыі, справе народа, справе комунізма.

**Аспірант А. ЛОЙКА.**

## Старонка гісторыі



Узнікненне нашага Беларускага дзяржаўнага універсітэта непарыўна звязана з вялікім Кастрычнікам, з ленінскай нацыянальнай палітыкай, з клопатамі Комуністычнай партыі аб развіцці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

Універсітэт быў арганізаван паводле вядомага дэкрэта Савецкай улады аб развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне, падпісанага В. І. Леніным. Пытанне аб пачатку работы Беларускага універсітэта стаяла на парадку дня ўсе суровыя рэвалюцыйныя гады. Магчыма, наш універсітэт распачаў-бы сваю работу ў 1918, 1919 або 1920 гг., але гэтаму перашкодзіла нямецкая, затым белапольская інтэрвенцыі.

11 ліпеня 1921 года, у дзень гадавіны вызвалення Мінска ад легіёнаў Пілсудскага, ва ўрачыстай абстаноўцы быў адкрыт Беларускі дзяржаўны універсітэт. Неацанімую дапамогу першай у Беларусі вышэйшай навучальнай установе аказала ўся Савецкая краіна. У адрас БДУ прыходзілі кнігі і абсталяванне з Масквы, Ленінграда, Казані і



многіх іншых гарадоў. Універсітэт быў адкрыт у складзе чатырох факультэтаў—педагагічнага, медыцынскага, рабочага і факультэта грамадскіх навук. Першым рэктарам нашага універсітэта быў вядомы гісторык В. І. Пічэта, а ў ліку яго першых выкладчыкаў—праф. Перцаў, праф. Нікольскі, народны паэт БССР Якуб Колас.

20 лютага 1925 года адбыўся першы выпуск БДУ. Упершыню ў гісторыі Беларусі вышэйшую адукацыю на роднай мове атрымалі 55 чалавек.

У лютым 1927 года на III сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта было прынята рашэнне аб будаўніцтве новых карпусоў для універсітэта—універсітэцкага гарадка. Для гэтай справы Савецкай дзяржавай былі асігнаваны мільёны рублёў. Закладка першага корпуса супала з 10-й гадавінай Кастрычніка.

Да канца першай пяцігодкі ў Беларусі ўжо налічвалася 12 вышэйшых навучальных устаноў. Многія з іх выраслі на базе універсітэта. Факультэтамі нашага універсітэта былі ў мінулым педагагічны інстытут імя Горкага, медыцынскі інстытут, інстытут народнай гаспадаркі, політэхнічны інстытут.

Выхаванцы універсітэта ішлі ва ўсе галіны народнай гаспадаркі і культуры. Яны будавалі новыя прамысловыя прадпрыемствы, папоўнілі армію настаўнікаў, работнікаў культурна-асветных устаноў. У 1932 годзе ў рэспубліцы, якая налічвала да рэвалюцыі 70 працэнтаў непісьменных, была закончана ліквідацыя непісьменнасці.

У 1933-34 гг. пры універсітэце была адкрыта аспірантура, якая падрыхтавала за час свайго існавання сотні высокакваліфікаваных навуковых работнікаў. У той-жа час пачало сваю работу завочнае аддзяленне універсітэта, якое дало вышэйшую адукацыю



без адрыву ад вытворчасці тысячам савецкіх грамадзян.

Грамадскасць Беларусі збіралася адзначыць 11 ліпеня 1941 года дваццацігоддзе свайго універсітэта. Але ажыццявіць гэтае мерапрыемства перашкодзіў напад на нашу краіну гітлераўскай Германіі. Фашысцкія захопнікі разбурылі універсітэт, нанёсшы яго гаспадарцы страты на шмат мільёнаў рублёў.

Савецкая дзяржава нават у самы суровы час праяўляла найвялікшыя клопаты аб развіцці ў рэспубліцы вышэйшай адукацыі. У 1943 годзе ва ўмовах Айчыннай



вайны на станцыі Сходня, пад Масквой, аднавіў сваю работу Беларускі універсітэт. Праз год ён працаваў ужо ў вызваленым Мінску. У аднаўленні універсітэта прыняла ўдзел уся краіна. Зноў прыслалі кнігі і абсталяванне многія гарады і універсітэты.

Прайшло некалькі год і Беларускі універсітэт, дзякуючы няспынным клопатам Комуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, не толькі аднавіў сваю разбураную гаспадарку, але і пашырыў яе, значна павялічыў прыём студэнтаў і выпуск высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**Аспірантка Я. ІКОННІКАВА**
**(кафедра гісторыі БССР).**

«БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
2 стар. 7 лістапада 1955 г.

# Дай руку, таварыш далёкі...

**Амстэрдам і Калькута, Тагоку і Прага... Далёка яны ад нашай рэспублікі — многія тысячы кіламетраў праляглі паміж гэтымі гарадамі і Мінскам. Розныя гэта гарады, розныя краіны, і дзяржаўны лад іх розны. Але дружба студэнтаў не ведае перашкод. Бо гэта дружба людзей, якія хочуць міру і шчасця для народаў усіх краін, усіх нацый. Аб міры і дружбе пішуць студэнтам нашага універсітэта і вясёлы галандскі паэт Ніко, і чэхаславацкая піонерважатая Ганка, і індыйская студэнтка Абха, і сур'ёзны рэфарматар законаў з Японіі Мінэо.**

**Гэтыя лісты—са згоды тых, каму яны адрасаваны, — мы і прапануем сёння вашай увазе.**

## ЯПОНІЯ

### *МІНЭО КОЯМА—СОВЕЦКАМУ СТУДЭНТУ*

Дарагі мой незнаёмы сябра!

Я вельмі рад напісаць вам гэтае пісьмо, даведаўшыся пра адрас Антыфашысцкага камітэта совецкай моладзі ад аднаго з маіх сяброў на сходзе «Не бываць вайне». Мы далі прысягу тады, што ніколі не возьмем зброі і што мы павінны працаваць для міру ва ўсім свеце.

Мне здаецца, каб дабіцца гэтага, мы павінны абменьвацца думкамі, меркаваннямі і павінны быць сябрамі з людзьмі ўсіх нацый. Вось чаму я пішу вам.

Перш за ўсё, дазвольце пазнаёміцца з вамі. Мне 20 год, я — студэнт другога курса універсітэта ў Тагоку. Я вывучаю законы. Мая мэта — стаць рэфарматарам законаў. Але закон залежыць ад дзяржаўнага ладу і эканомікі, таму я вывучаю эканоміку і гісторыю.

Зараз я жыву ў інтэрнаце пансіёна ў Сендэі, а мой дом, дзе я нарадзіўся, знаходзіцца ў Нагано. Нагано — самая высокая вобласць Японіі. Там многа гор. Яны вельмі прыгожыя, асабліва ўвосень. Мае любімыя заняткі — літаратура і спяванне. Я часта чытаю творы Талстога і іншых пісьменнікаў. Спяваю я вельмі дрэнна, але спяванне прыносіць мне задавальненне.

У нашы дні ў Японіі спевы вельмі папулярныя. Народ спявае аб міры і шчасці. Я вельмі зацікавіўся вашай сацыялістычнай краінай. Мне цікава ведаць, дзе вы займаецеся, якія вашы погляды на шлюб, на адносіны паміж мужчынам і жанчынай.

Калі вы зацікавіцеся мною, калі ласка, напішыце мне. Я з нецярплівасцю чакаю вашых пісем.

*Mineo Koyama*

* * *

## ІНДЫЯ

### *МІС АБХА ЧОЎДХУРЫ—У КАМІТЭТ КОМСАМОЛА*

У Індыі ёсць многа студэнтаў, якія хацелі-б перапісвацца з рускімі студэнтамі. Я таксама хацела-б перапісвацца з рускім студэнтам. Я вельмі люблю спорт, жывапіс, з'яўляюся членам малодшага ваеннага корпуса, які рыхтуе студэнтаў у галіне палявых дзеянняў, першай дапамогі, стральбы, работы па бяздротаваму тэлеграфу, радыё і тэлесувязі.

Дарагі далёкі таварыш! Раскажы мне ў сваіх пісьмах аб совецкай краіне, аб яе цудоўных людзях, аб тым, як жывуць і вучацца совецкія студэнты ў ВНУ.

З прывітаннем,

*Abha Chaudhuri*

* * *

## ГАЛАНДЫЯ

### *НІКО СХЕПМАКЕР—СОНІ КРУПІЧ*

... Як доўга не прыходзіла твае пісьмо! Я баяўся, што яно прыдзе занадта позна: заўтра раніцой я еду ў Югаславію на поўгоддзе—мне далі стыпендыю.

Дарагая беларуска, я нядаўна купіў збор вершаў Янкі Купалы. Учора я купіў «Преступление и наказание», што ўжо чытаў на галандскай мове, і творы Есеніна ў двух тамах.

Ты пытаешся, як мае поспехі са зборнікам вершаў. Добра і дрэнна. Я атрымаў для выдання зборніка 100 гульдэнаў — табе гэта здасца жартам. У Галандыі зусім немагчыма жыць, зарабляючы вершамі.

Амаль усе каталіцкія газеты (усяго 8), якія пісалі аб зборніку, выказалі адмоўную думку. Я цытую:

«Дзіўнае ўяўленне», «амаль кашчунства», «ён насміхаецца з сур'ёзных рэчаў», «беспрынцыповасць», «занадта свавольна», «выданне гэтага зборніка — памылка», «не паэзія». А адзін каталіцкі крытык нават патрабуе асмейваць мяне. Гэта не зусім добра з яго боку, праўда?

Бывае, яны часам гавораць і што-небудзь пазітыўнае, накшталт: «разумна і паэтычна», «прамадушна», «імкненне да свабоды», «ён закаханы ў жыццё». Але гэта толькі часам.

На шчасце, другія крытыкі пішуць: «У яго эластычная тэхніка,вялікае духоўнае жыццё. У Схепмакера ёсць фантазія і гумар. Яго можна было-б назваць сярэдзінай паміж Лодэйцэнам і Пітам Паальт'ентам. Яго верш не гучыць манерна».

Гэта напісана самым значным з сучасных галандскіх крытыкаў. (Лодэйцэн — самы шматабяцаўшы паэт пасля вайны, але ён памёр ад туберкулёзу ва ўзросце 27 год, Паальт'ент (1835 — 1894) — паэт іроніі і замагільнага гумару).

Другі крытык, сам добры паэт, піша: «У яго вершах жартаўлівая стыхія — і ў словаўжыванні, і ў поглядах. Але гэта не бесклапотная гульня. Ен ставіць вельмі многа праблем, хаця імкнецца паказаць, што толькі жангліруе імі. Асноўная тэма гэтых вершаў — сумненне паміж верай і няввер'ем, нябесным і зямным каханнем. Гэтыя вершы напісаны ў большасці сваёй вельмі кароткімі, нерыфмаванымі радкамі, якія не пазбаўлены гумару і маюць некалькі традыцыйны характар, што не можа не здзіўляць паэта, дзёрзкага і паўстаўшага, які пераварочвае значэнні слоў і вартасцей. Сярод многіх глыбокасур'ёзных паэтаў Схепмакер — паўстанец і, мяркуючы па дэбюту, мы можам спадзявацца на яго».

Гэта — усе. Пра астатняе напішу з Белграда. Цяпер мне трэба складвацца—я яшчэ не зусім гатоў. Заўтра трэба будзе ўстаць у палове шостай. Занадта рана для паэта; ці не праўда?

*Nico Scheepmaker* —

# Святочны МАР

### *НА ДЕТСКОМ УТРЕННИКЕ*

*Гостем без билета*
*Сон сюда проник—*
*В круг детишек это*
*Вышел массовик.*

*Распуская нюни,*
*Бродит сам не свой,*
*Словно накануне*
*Ссорился с женой.*

*Дети прошептали*
*мамам: «Умираем!*
*Ночь мы всю проспали,*
*Больше не желаем!»*



### БИОКОРПУС В ОКТЯБРЕ



Коридор, дорожка,
Кактус у окна...
Студенты на картошке,
И всюду—тишина.
В одной лишь аудитории
Горит сегодня свет,
Ученые в которой
Собрались на Совет.
Прикрыта дверь неплотно
И полумрак кругом...
Лишь чучела животных
Белеют за стеклом.
Зайчишки, вечно хмурые,
Сидят и рассуждают:
— Вот хитро профессура
С Совета удирает...
Когда б косой богатый
Их опыт перенял,
Поверьте, экспонатом
Он здесь бы не стоял.
Два плотных человека
Вдруг вниз ушли стрелой,
Один из них—Зазеко,
А Гуторов—другой.

ОЛЕГ СИНИЦКИЙ
(студент первого курса филфака)

В АУДИТОРИИ



В КОЛХОЗЕ



*В труде и науке не пачкая рук*

### КАМЕНТАРЫІ НЕ ПАТРЭБНЫ

*АШУКАНЫЯ НАДЗЕІ*



У гэтым доме многія супрацоўнікі універсітэта збіраліся справіць наваселле ў дні кастрычніцкага свята.

*У вестыбюлі хімкорпуса.*



*Пад фігавым лісточкам апошняй канструкцыі.*

АТ 08917 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 681. Тыраж 2000 экз. Рэдактар А. ВОЛК.